У першую групу ўвайшлі студэнты, якія не выяўляюць цікавасці да эстэтычнай дзейнасці, іх эстэтычная актыўнасць носіць выпадковы, сітуацыйны характар. Яны слухаюць радыё, зрэдку глядзяць тэлепраграмы; музеі, тэатры, мастацкія выставы наведваюць некалькі разоў у год, прычым колькасць гэтых наведванняў у іх застаецца на тым узроўні, якой была да паступлення ва універсітэт. Аддаюць перавагу літаратуры дэтэктыўнай ці навукова-фантастычнай. На пытанне: «Якую мэту Вы ставіце пры выбары кніг, наведванні тэатраў, выстаў, кінатэатраў?»-- даюць адказ: «Проста пазабаўляцца, адпачыць».

Другую групу склалі студэнты, якія валодаюць элементарнымі асновамі эстэтычных ведаў, праяўляюць пэўную цікавасць да эстэтычнай самаадукацыі. Яны часцей, чым да паступлення ў ВНУ, наведваюць розныя мерапрыемствы, але не ўцягнутыя ў стабільныя формы сацыяльна-культурнай дзейнасці. Імі кіруе толькі жаданне быць у курсе тых падзей культурнага жыцця, аб якіх больш за ўсё гавораць.

Да трэцяй групы мы аднеслі першакурснікаў з эстэтычнымі інтарэсамі, якія стабільна праяўляюцца ў жыцці. Мэта іх эстэтычнай самаадукацыі -- павышэнне культурнага ўзроўню, неабходнасць яго для паспяховай вучобы.

Асноўным якасным крытэрыем цікавасці да эстэтычнай самаадукацыі з'яўляецца творчая актыўнасць студэнтаў. Задача ВНУ -- мэтанакіраванае педагагічнае кіраўніцтва, пошук новых форм работы па эстэтычнаму выхаванню студэнтаў, фарміраванне ў іх інтарэсу да самаадукацыі ў галіне эстэтыкі, што спрыяе дыдактычнай сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі студэнтаў малодшых курсаў.

Скарына А.А.,
выкладчык

## ВЫКАРЫСТАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У ПРАЦЭСЕ ДАЛУЧЭННЯ ДЗЯЦЕЙ ДА КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Узмацненне грамадскага інтарэсу да гістарычнага вопыту і каштоўнасцей культуры мінулага сведчыць аб глыбокіх сацыяльных зменах, якія адбываюцца ва ўсім свеце ў апошняе дзесяцігоддзе. Сама патрэбнасць у засваенні спадчыны і асабістая выбіральнасць успрыняцця каштоўнасцей культуры фарміруюцца на аснове індывідуальнага сацыяльнага вопыту і таму знаходзяць сабе тлумачэнне не толькі ў асаблівасцях тэарэтычнага мыслення, але і сацыяльнай псіхалогіі суб'екта. Значыць, псіхалогію суб'екта можна фарміраваць. З аднаго боку, механізм фарміравання асобы першапачаткова закладзены ў прыродзе культурна-гістарычных традыцый. З другога, сацыялізацыі чалавека садзейнічаюць і несвядомыя сувязі, сутыкненні яго з разнастайнымі праяўленнямі культурнай спадчыны, якія нават самі па сабе ўключаюцца ў сферу фарміравання духоўнага патэнцыялу. Але найбольш прадуктыўным сродкам фарміравання духоўнага патэнцыялу з'яўляецца непасрэдная перадача сацыяльнага вопыту ад старэйшых пакаленняў малодшым пры цесным кантакце ў паўсядзённым жыцці. Сучасныя сувязі бацькоў і дзяцей па прычыне занятасці прафесійнай дзейнасцю першых носяць спантанны і бессістэмны характар, асабліва ў сферы мастацкіх інтарэсаў. Сёння сям'я страціла ролю лідэра ў сацыялізацыі падрастаючага пакалення.

Падтрыманню сацыяльнага статуса дзіцяці ў грамадстве, развіццю яго інтарэсаў, адаптацыі да змен у свеце, узмацненню гістарычнай свядомасці, далучэнню да традыцый народнай культуры могуць садзейнічаць цэнтры сацыякультурнага абслугоўвання, напрыклад цэнтры народнай культуры, нацыянальныя культурныя цэнтры. Яны могуць выконваць шмат функцыянальных задач, з'явіцца базай для дзейнасці рознага роду вучэбных цэнтраў і груп па інтарэсах, ствараць умовы для пасіўнага і актыўнага адпачынку дзяцей і інш. У іх можа ажыццяўляцца вывучэнне нацыянальнай культуры (ад выяўлення і вывучэння гістарычнай спадчыны свайго народа да стварэння ўмоў для распаўсюджвання прыдбаных ведаў у выглядзе кансультацый, семінараў, канцэртаў, свят і фестываляў, арганізацыі калектываў народнай творчасці).

Вялікае выхаваўчае і прапагандысцкае значэнне мела адкрыццё ў розных рэгіёнах краіны фальклорна-этнаграфічных музеяў пад адкрытым небам, дзе магчыма ўбачыць не толькі архітэктурныя пабудовы традыцыйнага ўкладу жыццядзейнасці нашых продкаў, але і іх «культурную атмасферу»: фальклорныя аўтэнтычныя песні, танцы, гульні, абрады. Арганізацыя такіх канцэртных выступленняў дзяцей разам з дарослымі з'явілася б своеасаблівай справаздачай дзяцей аб сваёй пошукавай краязнаўчай дзейнасці, прапагандай нацыянальнай культуры і яркім прыкладам для пераймання. Усё гэта служыла б паспяховаму ўключэнню «класічных» нацыянальных каштоўнасцей у кантэкст сучасных культурных працэсаў.

Пархамовіч Т.А.,
аспірантка

## НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ ЭТНАПСІХАЛАГІЧНАГА АНАЛІЗУ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Час сённяшні – гэта час новага адраджэння для беларускага этнасу.

Гістарычны лёс беларусаў быў нялёгкім і супярэчлівым, але ж і паняцце «беларусы» было не заўсёды



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зразумелым для акружаючых. Таму актуальнасць даследаванняў этнічнай самасвядомасці беларусаў, іх этнапсіхалогіі вызначаецца неабходнасцю сучаснага падыходу да ўсяго комплексу пытанняў, якія звязаны з праблемай больш глыбокага вывучэння беларускага народа, яго рэгіянальных асаблівасцей.

Для даследавання этнічнай свядомасці сучасных беларусаў неабходна правесці ў агульным плане аналіз свядомасці нашых продкаў. Рэканструяванне свядомасці этнасу магчыма праз даследаванне народных звычаяў і абрадаў, праз расшыфроўванне першапачатковага сэнсу розных рытуалаў.

Праблема этнапсіхалагічнага аналізу музычнай творчасці, як і праблема вывучэння асаблівасцей беларускага народа ўвогуле, з'яўляецца актуальнай, асабліва ўлічваючы наступныя абставіны:

– адсутнасць якіх-небудзь сур'ёзных этнапсіхалагічных даследаванняў нацыянальнай самасвядомасці ў Рэспубліцы Беларусь, якія адпавядаюць сучасным патрабаванням;

– неабходнасць такога навуковага абгрунтавага падыходу, які б грунтаваўся на этнапсіхалагічным фундаменце ў рэчышчы адраджэння беларускай культуры;

– неабходнасць у перыяд станаўлення рэспублікі як незалежнай краіны стварэння ўласнай навуковай этнапсіхалагічнай школы, прызначанай унесці свой уклад у развіццё беларускай культуры.

Выбранне намі ў якасці аб'екта даследавання музычна-паэтычнай творчасці абумоўлена тым, што менавіта ў гэтым чыстым, свабодным ад спекулятыўных, палітызаваных напластаванняў напрамку прадстаўлена своеасаблівасць народнай творчасці і захаваны яе традыцыі.

Параўнальны аналіз прадуктаў музычна-паэтычнай культуры ў гістарычным і рэгіянальным зрэзах дазваляе рэканструяваць асаблівасці нацыянальнай псіхалогіі, выявіць і прааналізаваць характэрныя для яе тэндэнцыі і заканамернасці, распрацаваць інструменты тонкага вывучэння своеасаблівасцей творцаў народнай культуры.

Такім чынам, галоўнымі напрамкамі этнапсіхалагічнага аналізу самасвядомасці этнасу з'яўляюцца распрацоўка метадаў этнапсіхалагічнага аналізу, азнаямленне з вопытам этнапсіхалагічнага вывучэння традыцый з мэтай выяўлення асаблівасцей нацыянальнай псіхалогіі, распрацоўка інструментарыя этнапсіхалагічнай рэканструкцыі нацыянальнай псіхалогіі з улікам прадуктаў музычна-паэтычнай культуры, пошук шляхоў і сродкаў, механізмаў адраджэння нацыянальнай культуры.

Бялоў У.І.,
дацэнт

## РОЛЯ РЭЖЫСУРЫ ПРАГРАМ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ВОЛЬНАГА ЧАСУ Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ
(падрыхтоўка сацыяльнага педагога)

У сферы прафесійнай дзейнасці сацыяльнага педагога знаходзяцца сям'я, падлеткавыя клубы, аб'яднанні моладзі, цэнтры культуры па арганізацыі вольнага часу. Аднак дзейнасць у гэтым напрамку патрабуе асаблівай прафесійнай падрыхтоўкі, паколькі яна мае сувязь з рашэннем праблем арганізацыі вольнага часу дзяцей і падлеткаў. Для гэтага неабходны веды і навыкі арганізацыйна-творчай дзейнасці. Каб дасягнуць поспехаў у названай дзейнасці, педагог павінен перш за ўсё быць сацыяльна актыўным грамадзянінам, мець сваю пазіцыю. Ён павінен добра ведаць літаратуру, валодаць законамі драматургіі і сцэнарнага майстэрства, адчуваць прыроду драматургічнага канфлікту, асаблівасці стварэння мастацкага вобраза, умець працаваць з выканаўцамі праграм па арганізацыі вольнага часу ў сферы культуры, захапляць іх сваёй творчай задумай.

Будучы пастаноўшчык праграм павінен умець працаваць з музычным матэрыялам, арганізоўваць выканаўцаў на дасягненне адзінай мэты. Для гэтага сацыяльнаму педагогу неабходна разам з ведамі аб сацыяльнай педагогіцы і асаблівасцях сацыяльнага выхавання таксама мець і навыкі арганізацыі культурнай дзейнасці у вольны час, у аснове якой -- рэжысура адпаведных праграм.

Рэжысура гэтых праграм уяўляе па сутнасці сінтэтычную дзею, якая спалучае слова, пластыку, музыку, святло, гукавую структуру. У працэсе стварэння праграмы сацыяльны педагог плануе яе сэнсавую і эмацыянальную структуру, адлюстроўвае гэтую структуру ў сцэнарыі, знаходзіць рэжысёрскае рашэнне праграмы і потым ажыццяўляе пастаноўку.

Галоўная мэта рэжысёра -- пошук арыгінальнага рашэння творчай задумы. Для поспеху ў рэжысёрскай працы неабходна авалодаць асновамі рэжысуры праграм па арганізацыі вольнага часу ў сферы культуры.

У аснову навучання студэнтаў рэжысуры пакладзена творчая і педагагічная практыка К.С.Станіслаўскага і яго паслядоўнікаў.

Навучальны працэс дае магчымасць студэнтам засвоіць прынцыпы і прыёмы рэжысуры, асаблівасці работы над нумарам, над пастаноўкай праграмы.

Методыка выкладання прадугледжвае вывучэнне раздзелаў паэтапна. На першым этапе фарміруюцца індывідуальныя якасці валодання элементамі акцёрскага майстэрства (выканаўчы трэнінг); на другім этапе выпрацоўваюцца ўменні і навыкі работы рэжысёра над нумарам, а потым над праграмай.